5. *Smith Sc. Th.* Land and Book: Literature and Land Tenure in Anglo-Saxon England. Toronto: University of Toronto Press, 2012. 288 p.

6. *Болдырева И. И.* Англосаксонские аристократки X–XI веков в земельных спорах // Научный диалог. 2016. № 11. С. 181–192.

7. The Fonthill Letter // The Cambridge Old English Reader/ Cambridge: Cambridge University Press, 2004. P. 96–102.

8. *Birch W.* de Gray Cartularium Saxonicum. Vol. 3. L. : Whiting and Company, 1899. 696 p.

***Ерашэвіч А. У.***

*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт* (*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*)

## АРГАНІЗАЦЫЯ І ФУНКЦЫЯНАВАННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ ФІНАНСАЎ ГУБЕРНЯЎ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст.: СУЧАСНАЯ АЙЧЫННАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

Улічваючы шматаспектнасць праблемы, а таксама неадназначную трактоўку зместа і сутнасці паняцця «дзяржаўныя фінансы», іх структуры і функцый у сучаснай эканамічнай навуцы, прадставім толькі стан вывучанасці гэтага пытання сучаснымі беларускімі гісторыкамі. З гэтай нагоды матэрыял падаецца па пэўных тэматычных блоках.

Пры вывучэнні стану і характару дзяржаўных фінансаў пасля ўваходжання асноўнай часткі беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў (1772, 1793, 1795 гг.) да ліку дыскусійных пытанняў адносіцца праблема вызначэння геаграфічных і храналагічных рамак даследавання.

Частыя змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле беларускіх зямель адбываліся ў часы кіравання Кацярыны II і Паўла I працягнуліся і пры панаванні наступных імператараў – Аляксандра I і Мікалая I [51, с. 266.]. Палітыка ж расійскага ўрада ў бюджэтна-фінансавай сферы на тэрыторыі губерняў Беларусі ці дзяржаўная фінансавая палітыка па фарміраванні і пераўтварэнні элементаў фінансава-крэдытнай сістэмы ў ходзе асноўных стадый працэса, накіраванага на паступовую змену і развіццё комплекса фінансавых адносін у пэўным напрамку шляхам механізма і адпаведных інструментаў, не вырашалася цэнтральнымі ўладамі як асобная задача ў ходзе правядзення палітыкі дэпаланізацыі і русіфікацыі края (у адрозненне, напрыклад, ад сістэмы мерапрыемстваў па «разбору» шляхты ці

памяншэнні ідэалагічнага ўплыву і эканамічнай магутнасці рымска-каталіцкай царквы). Разам з тым, губерні Беларусі і Літвы не мелі, у адрозненне ад суседняга Царства (Каралеўства) Польскага, асобнага спецыяльнага фінансавага адміністрацыйнага апарату і цэнтралізаванага фонду грашовых сродкаў. Больш за тое, не назіралася мэтавай узгодненасці ў вызначэнні складовых частак (грашовая, крэдытная, падатковая, бюджэтная, мытная), устанаўленні асноўных этапаў распрацоўкі і рэалізацыі, выяўленні асноўных напрамкаў правядзення (фіскальны, рэгулюючы, стымулюючы, дыскрэцыённы) дзяржаўнай фінансавай палітыкі як складаючай часткі сацыяльна-эканамічнай палітыкі дзяржавы, якія маглі ажыццяўляцца ў розныя прамежкі часу (напрыклад, грашовая рэформа Я. Ф. Канкрына 1839–1843 гг.; рэформа банкаўскай справы ў 1857–1860 гг., у выніку якой была ліквідавана сістэма старых казённых банкаў і ў 1860 г. быў створаны цэнтральны Дзяржаўны банк Расійскай імперыі, які спалучаў функцыю эмісійнага цэнтра і інстытута крэдытнай камерцыйнай дзейнасці). Іншымі словамі, вельмі складана рэканструіраваць і вызначыць змест, сутнасць, прынцыпы і характар фінансавай палітыкі расійскага царызму на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. цалкам, а адпаведна высветліць асаблівасці яе рэалізацыі. Гэтыя абставіны абумовілі разгляд навуковай інтэрпрэтацыі і ацэнкі айчыннымі гісторыкамі праблемы арганізацыі і функцыянавання дзяржаўных фінансаў на тэрыторыі Беларусі ў часы кіравання Кацярыны II, Паўла I, Аляксандра I, Мікалая I (згодна яе падзелу на пэўныя прадметныя праблемныя групы, без уліку аўтарскіх публікацый).

*Грашовае абарачэнне.* Сучасная беларуская гістарыяграфія праблемы вызначэння прынцыпаў, формаў, метадаў, механізму, інструментаў, характару і асаблівасці грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. прадстаўлена, у асноўным, альбо працамі гісторыкаў-краязнаўцаў, лакалізаванымі па прасторы і часу [4; 17; 41], прысвечаных пэўнай асобнай падзеі ці з'яве (прыкладам, лёсу Полацкага часовага манетнага двара [35; 67]), ці раздзеламі ў абагульняючых вучэбных дапаможніках [22; 30], альбо матэрыяламі ў абагульняючых працах [53]. Большую цікавасць і інтарэс уяўляюць даныя, прыведзеныя ў даследаваннях прафесійных беларускіх нумізматаў (І. Сінчук, І. Колабава і інш.), якія вывучалі грашовы асартымент знойдзеных манетных скарбаў [33; 38–39], паспрабавалі разабрацца ў складанай праблеме грашовай тэрміналогіі, ліку і курсу грашовых адзінак на беларускіх землях у пэўныя прамежкі часу [36; 40; 59–60]. Шмат

публікацый, на аснове аналізу вытрымак і даведак з архіўных першакрыніцаў, І. Колабава прысвяціла з'яве фальсіфікацыі грашовых знакаў на тэрыторыі Беларусі ў першай палове XIX ст. Шэраг звестак з гісторыі абарачэння як манет, так і папяровых грашовых знакаў, фактаў фальшываманецтва прыведзены ў адным з раздзелаў абагульняючай працы вядомага беларускага нумізмата В. Н. Рабцэвіча, які, у цэлым, не ўдзяліў, у параўнанні з папярэднымі перыядамі, шмат увагі асаблівасцям грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі часоў знаходжання яе зямель у складзе Расійскай імперыі [55, с. 267–289]. Віцебскі даследчык В. А. Шышанаў паспрабаваў вызначыць асаблівасці абарачэння на мясцовым грашовым рынку губерняў Беларусі рускіх асігнацый на мяжы XVIII–XIX ст., а таксама замежнай білоннай манеты ў першай палове XIX ст. [70–71]. Гісторык прыйшоў да высновы, што нізкі курс расійскіх асігнацый і немагчымасць насыціць рынак сярэбранай і меднай манетай былі адной з асноўных прычын, якая перашкаджала ўніфікацыі грашовай сістэмы Беларусі ў гэты час.

Пэўнае месца ў працах беларускіх гісторыкаў і аматараў баністыкі займае праблема ўкаранення ў беларускіх землях расійскіх папяровых грошай [18; 52–53]. Найбольш значнае даследаванне па праблеме папярова-грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі ў XVIII–XIX ст. належыць брэсцкаму гісторыку А. М. Баюре [5, с. 7–28], які ў пэўных раздзелах працы напісаў пра з'яўленне папяровых грошай: расійскіх асігнацый на Усходзе Беларусі пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай, скарбовых білетаў Нацыянальнай Найвышэйшай Рады ў час паўстання 1794 г., расійскіх асігнацый у 1786–1818 гг., дэпазітных і крэдытных білетаў часоў сістэмы сярэбранага манаметалізму, уведзенай рэформай Я. Ф. Канкрына. Тым не менш, у даследаваннях па баністыцы адным з дыскусійных застаецца пытанне вызначэння і класіфікацыі папяровых грашовых знакаў кошту, іх сурагатаў. Такім чынам, грашовая гаспадарка беларускіх зямель канца XVIII – першай паловы XIX ст. у той ці іншай ступені з'яўлялася прадметам даследаванняў як прафесійных гісторыкаў, так і нумізматаў і баністаў-аматараў. Аднак заўважым, што дагэтуль адсутнічае спецыяльнае комплекснае даследаванне асаблівасцяў грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі ў азначаны час з улікам аналізу шматлікіх канкрэтна-гістарычных даных як рэчавых (нумізматычных), так і асабліва шматлікіх і разнастайных неапублікаваных архіўных крыніц.

*Дзяржаўны крэдыт. Банкаўская справа.* Сярод сучасных беларускіх гісторыкаў розныя аспекты фарміравання, функцыянавання і развіцця

як сістэмы мясцовых казённых іпатэчных крэдытных установаў на тэрыторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст., так і ўдзел адміністрацыйных установаў і заможнага насельніцтва губерняў Беларусі ў актыўных і пасіўных фінансавых аперацыях агульнаімперскіх цэнтральных дзяржаўных банкаўскіх установаў вывучаюць Ю. Л. Грузіцкі [19, с. 16–21; 20–28] і Е. А. Драздова (Бруханчык) [8; 31–32]. Аднак у цэлым вымушаны канстатаваць, што праблеме вызначэння спецыфікі функцыянавання дзяржаўных крэдытных інстытутаў на тэрыторыі Беларусі ў дадзены час, у параўнанні з пазнейшым перыядам станаўлення і развіцця капіталістычных і таварна-грашовых адносін у эканоміцы беларускіх зямель, удзелена недастатковая ўвага з боку айчынных гісторыкаў.

Арганізацыйна-прававое рэгуляванне фінансавых адносін. Фінансавае заканадаўства. Мясцовыя адміністрацыйныя органы па кіраванні дзяржаўнымі фінансамі (фінансавыя, падатковыя, крэдытныя, мытныя). Адным з пытанняў у даследаваннях прадстаўнікоў сучаснай айчыннай гістарыяграфіі з'яўляецца высвятленне арганізацыі сістэмы адміністрацыйна-паліцэйскіх мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання ў беларуска-літоўскіх губернях. У прыватнасці, у артыкулах і дысертацыі І. М. Трасцян прааналізавана арганізацыя і функцыянаванне інстытутаў ваеннага губернатарства і генерал-губернатарскага кіравання, грамадзянскага губернатарства, губернскага праўлення на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1856 гг. [65]. Даследчыца паказала іх месца і ролю ў сістэме дзяржаўных органаў мясцовай улады і кіравання, высветлены асаблівасці фарміравання органаў мясцовага дзяржаўнага кіравання губернскай адміністрацыі. Вывучаючы працэс эвалюцыі сістэмы мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання на тэрыторыі Беларусі ад часоў Кацярыны II да Мікалая I, І. М. Трасцян ахарактарызавала ўмовы фарміравання кіравання фінансава-падатковай сферай жыццядзейнасці грамадства земляў Беларусі праз паказ структуры і функцый фінансава-падатковых установаў і органаў кіравання дзяржмаёмасцю. Аднак у цэлым, зыходзячы з мэты і задач даследавання, гэтыя сюжэты не з'яўляліся прыярытэтнымі.

Безумоўна, што пры вызначэнні характэрных рыс дзейнасці мясцовых адміністрацыйных органаў па кіраванні дзяржаўнымі фінансамі айчынныя гісторыкі і правазнаўцы ў той ці іншай ступені высвятлялі асновы прававой рэгламентацыі фінансавых адносін шляхам пералічэння правоў і абавязкаў (функцый) пэўных установаў ці службовых асобаў фінансавай адміністрацыі. Тым не менш, гэтыя заяўленыя аўтарам праблемы патра-

буюць больш дэталёвага, канкрэтна-гістарычнага разгляду з улікам уводу ў навуковы зварот шэрагу неапублікаваных архіўных звестак, аналізу матэрыялаў апублікаваных крыніцаў, пераасэнсавання гістарыяграфічных здабыткаў, выкарыстання тэарэтыка-метадалагічных падыходаў сучаснай тэорыі дзяржаўнага кіравання.

*Дзяржаўны бюджэт губерняў Беларусі (даходная і расходная часткі). Дзяржаўны фінансавы кантроль.* Пазбаўленыя ўласнай нацыянальнай дзяржаўнасці, не меўшыя статуса фіскальнай аўтаноміі і адпаведна цэнтралізаванага фонду грашовых сродкаў, губерні Беларусі з'яўляліся складовай часткай бюджэтнай сістэмы Расійскай імперыі, якая ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. вылучалася такімі атрыбутыўнымі адзнакамі, як дэцэнтралізаванасць ці ведамасны характар грашовых фондаў, рознаўзроўневасць крыніц грашовых падаткаў і збораў паводле месцаў іх касавых паступленняў, прызначэння, відаў, формаў, характару (пастаянныя, часовыя, аднаразовыя; прамыя і ўскосныя; агульна-дзяржаўныя, губернскія ці земскія, гарадскія, саслоўныя дваранскай карпарацыі, грамад дзяржаўных, удзельных сялян, аднадворцаў, яўрэйскіх таварыстваў і інш.).

Аснову даходнай часткі бюджэтаў розных узроўняў губерняў Беларусі складалі акладныя і неакладныя плацяжы падатковага характару, якія спаганяліся з розных катэгорый падатковага насельніцтва і сфер дзейнасці. Непадатковыя прыбыткі ад продажу дзяржмаёмасці на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. не ігралі значнай ролі ў структуры агульных грашовых паступленняў [63]. У кантэксце вывучэння пэўных тэм беларускія гісторыкі ў той ці іншай ступені дакладнасці і паўнаты закраналі ў спецыяльных і абагульняючых працах праблемы падаткаабкладання сялян [2; 14; 15], мяшчан гарадоў [48] і мястэчак [62], купцоў [54; 58], аднадворцаў і грамадзян [49], яўрэяў [1; 61], сферы гандлёвай дзейнасці [3; 9–11; 68]. У сувязі з разглядам асобных праблем беларускія навукоўцы таксама разглядалі пытанні арганізацыйна-фінансавага механізму забеспячэння дзейнасці ўрадавых губернскіх і павятовых бюракратычных установаў розных узроўняў, ведамстваў і прызначэння [42]. Асобныя фрагментарныя даныя можна знайсці ў кваліфікаваных працах, кнігах і артыкулах, прысвечаных некаторым катэгорыям груп асноўных дзяржаўных выдаткаў. Падобныя фрагмантарныя гістарычныя факты адносна фінансавання і крэдытавання ваеннай справы беларускіх зямель змяшчаюцца ў працах А. М. Лукашэвіча [47], А. Л. Самовіча [56], культурнай сферы – у кнізе С. Я. Куль-Сяльверставай [43].

У рамках вывучэння канфесійнай палітыкі расійскага царызму [66] і дзяржаўна-рэлігійных адносінаў спецыялістамі ў дадзенай праблематыцы згадваваюцца выпадкі дзяржаўнага фінансавання дзейнасці ўстановаў і службовых асобаў розных плыняў хрысціянскай царквы: рымска-каталіцкай (А. І. Ганчарук) [13], уніяцкай (С. В. Марозава, Дз. В. Лісейчыкаў) [44–45; 50], праваслаўнай (П. В. Шэўкун) [69], стараабраднiцтва (А. А. Гарбацкі) [16]. Значная колькасць даследаванняўбеларускіх гісторыкаў прысвечана вывучэнню розных аспектаў арганізацыі і дзейнасці разнастайных тыпаў навучальных установаў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. [29; 57], у тым ліку асобна – праваслаўнага духоўнага ведамства [12], рымска-каталіцкай царквы [34], ваенна-навучальных [6; 7]. Зразумела, што ў кнігах і артыкулах па такога роду тэматыцы сустракаецца інфармацыя адносна фінансавання як навучальных установаў, так і асобных чыноў вучэбнай адміністрацыі.

Адным з накірункаў даследаванняў беларускай гістарычнай навукі апошніх дзесяцігоддзяў, як ўжо згадвалася, стала вывучэнне сістэмы арганізацыі, структуры і функцый асобных мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання на тэрыторыі Беларусі ў азначаны час. Безумоўна, што пры даследаванні розных аспектаў арганізацыі, спосабаў фарміравання і напрамкаў дзейнасці адміністрацыйна-бюракратычнага апарату царызму ў Беларусі беларускія гісторыкі (С. М. Токць, А. А. Кісялёў, С. Л. Лугаўцова і інш.) не маглі не абмінуць увагай пытанні, звязаныя з прынцыпамі камплектавання губернскіх і ўездных уладных структур, асаблівасцямі фарміравання кадравага складу дзяржаўных служачых мясцовых органаў улады і кіравання [46; 64]. Высвятляючы месца (статус) і ролю чыноўніцкага корпуса ў іерархічнай сістэме дзяржаўнага кіравання губерняў Беларусі, вучоныя звярталі пэўную ўвагу на пытанне матэрыяльнага стану дзяржаўных служачых, паспрабавалі вызначыць вядучыя крыніцы даходаў мясцовай бюракратыі, віды і памеры грашовага ўтрымання чыноўнікаў [37]. Тым не менш, асобнага комплекснага даследавання адносна бюджэтаў губерняў пакуль яшчэ не створана. Няма і прац наконт такой важнай стадыі бюджэтнага працэсу, як арганізацыя і функцыянаванне сістэмы дзяржаўнага фінансавага кантролю.

Такім чынам, у працах прадстаўнікоў айчыннай гістарычнай навукі часоў існавання Рэспублікі Беларусь утрымліваецца шэраг каштоўных, але фрагментарных фактаў, часам важных разважанняў над шляхамі вырашэння розных аспектаў пастаўленай аўтарам актуальнай праблемы.

Кароткі агляд стану распрацаванасці праблемы ў гістарычных даследаваннях, вопыт постсавецкай беларускай гістарыяграфіі і недастатковая ступень вывучанасці ў навуковай гістарычнай літаратуры апошніх дзесяцігоддзяў стану дзяржаўных фінансаў губерняў Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. пераконвае ў тым, што адным з напрамкаў далейшых даследаванняў можа стаць напісанне манаграфічных прац па кожнаму з акрэсленых тэматычных блокаў. Акрамя таго, неабходна стварэнне і компекснай спецыяльнай працы аб своеасаблівасцях фінансавай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі губерняў Беларусі ў азначаны час на аснове аналізу і навуковай інтэрпрэтацыі даных як неапублікаваных архіўных, так і апублікаваных крыніц, узважанай ацэнкі і пераасэнсавання гістарыяграфічнай спадчыны – з улікам міждысцыплінарнага падыходу і комплекснага выкарыстання метадаў іншых сацыяльна-гуманітарных навук.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Анішчанка Я. К.* Фінансавая рэвізія кагалаў Гродзенскай губерні ў пачатку XIX ст. // Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 1995. № 1. С. 45–53.

2. *Анішчанка Я. К.* Фінансавыя мерапрыемствы адміністрацыі Кацярыны II у дзяржаўных маёнтках Беларусі // Весці Акадэміі наук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 1993. № 2. С. 77–86.

3. *Атрушкевич М. М.* Городское законодательство в Беларуси в 1820–1830-х гг. (гильдейская реформа Е. Ф. Канкрина) // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 2011. Сер. 3. № 1. С. 97–100.

4. *Балябин А. А.* Денежные знаки на Борисовщине в период войны 1812 г. // Колодеевские чтения: сборник материалов: 200-летию событий войны 1812 г. на Борисовщине посвящается / сост. И. А. Карпова [и др.]. Борисов : Борисовская укрупн. тип., 2012. С. 300–306.

5. *Баюра А. Н.* Бумажно-денежное обращение на территории Беларуси в XVIII–XIX веках. Брест : Изд-во БГТУ, 2003. 124 с.

6. *Бригадин П. И., Лукашевич А. М.* Военная школа Беларуси. XVIII – первая четверть XIX в. Минск : БГУ, 2004. 117 с.

7. *Бригадин, П. И., Лукашевич А. М.* Мятежный корпус: из истории Александровского Брестского кадетского корпуса (1842–1863 гг.). Минск : ГИУСТ БГУ, 2007. 182 с.

8. *Бруханчик Е. А.* Кредитные операции Приказов общественного призрения в Беларуси в конце XVIII – середине XIX в. // Гуманітарна-эканамічны веснік. 2010. № 4. С. 106–112.

9. *Бурачонок А. В.* Налогообложение торговой деятельности сельского населения Беларуси в первой половине XIX в. // Історія торгівлі, податків та мита: тезидоповідей X міжнародної науковоїконференції. Київ, 2016. С. 50–52.

10. *Бурачонак А. В.* Эвалюцыя заканадаўства ў сферы падаткаабкладання гандлю на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. // Беларускі археаграфічны штогоднік / рэдкал.: Э. М. Савіцкі (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелНДІДАС, 2016. Вып. 17. С. 118–133.

11. *Бурачонак А. В.* Змены ў падаткаабкладанні гандлёвай дзейнасці купецтва на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. // Гісторыя гандлю на тэрыторыі Беларусі: зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; уклад.: А. А. Скеп'ян; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск : Беларуская навука, 2016. С. 256–265.

12. *Восович С. М.* Учебные заведения православного духовного ведомства в Беларуси, конец XVIII в. – 1914 г.: дис. … канд. истор. наук: 07.00.02. Минск, 2003. 268 л.

13. *Ганчарук І. Г., Ганчар А.* І. Рымска-Каталіцкі Касцёл у Беларусі (1772–1830 гг.): манаграфія. Гродна: ГДАУ, 2012. 382 с.

14. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : Экаперспектыва, 2000–2006. Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. 2005. 519 с.

15. Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. / пад рэд. В. І. Мялешкі [і інш.]. Мінск : Беларуская навука, 1997. Т. 1. Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. / Я. Анішчанка [і інш.]. 1997. 431 с.

16. *Горбацкий А. А.* Старообрядчество на белорусских землях: монография. Брест: БрГУ им. А. С. Пушкина, 2004. 237 с.

17. Гринкевич В. Монеты периода восстания 1830–1831 годов. Топография находок на территории современной Республики Беларусь // Банкаўскі веснік. 2017. № 12. С. 51–53.

18. *Грузицкий Ю.* Ассигнации – первые бумажные деньги Российской империи // Вестник Ассоциации белорусских банков. 2000. № 47. С. 45–49.

19. *Грузицкий Ю. Л.* Банки Беларуси (70-е гг. XIX – начало XX в.). Минск : Экоперспектива, 2005. 167 с.

20. *Грузицкий Ю. Л.* Государственный заемный банк (1786–1859) // Банкаўскі веснік. 2009. № 31. С. 58–62.

21. *Грузицкий Ю. Л.* Гродненский приказ общественного призрения – первый губернский банк (1805–1859 гг.) // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі: да 880-годдзя горада. Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Гродна, 10–11 красавіка 2008 г.) / рэдкал. А. І. Антоненка [і інш.]. Гродна, 2008. С. 189–193.

22. *Грузицкий Ю. Л.* История развития денежно-кредитной системы Беларуси: учебное пособие; под ред. В. Н. Рябцевича. 3-е изд., исправл. и доп. Минск : Экоперспектива, 2007. 231 с.

23. *Грузицкий Ю. Л.* Казенные банки в Беларуси // Веснік Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта. 2010. № 1. С. 91–95.

24. *Грузицкий Ю. Л.* Сохранная казна как ипотечное кредитное учреждение (1772–1859) // Банкаўскі веснік. 2010. № 13. С. 65–68.

25. *Грузіцкі Ю. Л.* Станаўленне і развіццё банкаўскай сістэмы ў Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2008. № 7. С. 14–20.

26. *Грузицкий Ю. Л.* Формирование кредитных учреждений в докапиталистической Беларуси // Вестник Ассоциации белорусских банков. 2008. № 15. С. 33–37.

27. *Грузицкий Ю. Л.* Частная ипотека в позднефеодальной Беларуси // Банкаўскі веснік. 2011. № 1. С. 64–67.

28. *Грузицкий Ю. Л.* Частный ипотечный кредит в феодальной Беларуси // Вестник Ассоциации белорусских банков. 2008. № 34. С. 24–28.

29. *Гурецкий А.* Политика царизма в области образования в Белоруссии в конце XVIII – первой четверти XIX в. (1772–1825 гг.) : автореф. ... дис. канд. ист. наук: 07.00.02 ; Белорус. гос. пед. ун-т. Минск, 1998. 20 с.

30. *Донских С. В.* История развития финансово-кредитной системы: пособие по одноименному курсу для студентов специальности 1-25 01 04 финансы и кредит. Гродно : ГрГУ, 2008. 347 с.

31. *Дроздова Е. А.* Городские общественные банки белорусских губерний (1785–1914) // Банкаўскі веснік. 2006. № 13. С. 58–62.

32. *Дроздова Е.* А. Учреждения мелкого кредита в белорусских губерниях (1840–1917) // Банкаўскі веснік. 2007. № 1. С. 59–65.

33. *Зайцева О. Е., Синчук И. И.* Находки монет 16–20 вв. в Дисне и Друе (к истории товарно-денежных отношений города и округи). Минск : Технопринт, 2001. 64 с.

34. *Зянюк Р. У.* Навучальныя ўстановы рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі (1772–1914 гг.). Мінск : Беларуская навука, 2017. 299 с.

35. *Касмылёў В. С.* Полацкі часовы манеты двор // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : тэз. дакл. навук. канф., прысвеч. 1130-годдзю Полацка. Полацк, 1992. С. 29.

36. *Квизикявичус Л., Синчук И.* Курс рубля медью в серебряных копейках в 1803–1811 гг. по расходным записям Минской консистории // Двенадцатая Всероссийская нумизматическая конференция, Москва, 19–24 апреля 2004 г.: тез. докл. и сообщ. М., 2004. С. 178–179.

37. *Киселёв А. А.* Система управления и чиновничество белорусских губерний в конце XVIII – первой половине XIX в. Монография. Мінск : Военная академия РБ, 2007. 172 с.

38. *Колабава І. Н.* Архіўныя дакументы XIX – пачатку XX ст. аб знаходках манетных скарбаў на тэрыторыі Беларусі і набліжаных рэгіёнаў // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 23–24 кастрычніка 2014 г. / Віцебскі абласны краязнаўчы музей; рэдкал.: Г. У. Савіцкі [і інш.]. Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2017. С. 90–97.

39. *Колобова И.* Монеты восстания 1830–1831 гг. на территории Беларуси // Białoruś, Litwa, Polska, Ukraina: Wspólne dzieje pieniądza. Supraśl, 20–22. X. 1994: materiałyz I Międzynarodowej konferencji Numizmatycznej. Warszawa, 1996. S. 133–136.

40. *Колобова И. Н.* О денежной терминологии на территории Беларуси во второй четверти XIX в. // Нумизматические коллекции: наследие исторической Лит-

вы и связанных с ней стран – открытия для просвещения и науки: тезисы докладов Международной нумизматической конференции, Вильнюс, Национальный музей Литвы, 23–25 мая 2012 г. Вильнюс, 2012. С. 182–183.

41. *Корзун* А. Денежное обращение на Гродненщине в конце XVIII – середине XIX в. // Банкаўскі веснік. 2006. № 4. С. 31–33.

42. *Корсак О. В*. Финансирование статистических комитетов белорусских губерний Российской империи (1830-е – начало 1900-х гг.) // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3. Гісторыя. Эканоміка. Права. 2016. № 1. С. 9–13.

43. *Куль-Сяльверстава С. Я*. Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: фарміраванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIII ст. – 1820-я гады). Мінск : БДУ, 2000. 260 с.

44. *Лісейчыкаў Д. В*. Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель 1720–1839 гг. Мінск : Медысонт, 2011. 195 с.

45. *Лісейсыкаў Д. В*. Святар у беларускім соцыуме: прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596–1839 гг. Мінск : Беларусь, 2015. 717 с.

46. *Луговцова С. Л*. Полицейские органы на территории белорусских губерний Российской империи в 30–40-е гг. XIX в.: формирование и деятельность // Органы государственной власти и местного самоуправления: традиции и современность (к 150-летию земской реформы в России): материалы Международной науч.-практ. конф., РАНХ и ГС; ПсковГУ, 13 ноября 2014 г. Псков, 2015. С. 128–137.

47. *Лукашевич А. М*. Белорусские земли в военно-стратегических планах Российской империи (конец XVIII в. – 1812 г.) : автореф. дис. … докт. истор. наук: 07.00.02; БГУ. Минск, 2014. 48 с.

48. *Люты А. М*. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст. Мінск: БДПУ, 2004. 320 с.

49. *Макарэвіч В. С*. Дробная шляхта Беларусі ў 30-60-я гг. XIX ст.: склад і эвалюцыя сацыяльна-прававога становішча: дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02. Минск, 2008. 158 л.

50. *Марозава С. В*. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гг.). Гродна : ГрДУ, 2001. 352 с.

51. *Насевіч В*. Свянцянскі павет // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мінск: Бел. Энцыклапедыя, 1993–2003. Т. 6. Кн. 1. 2001. С. 266.

52. *Орлов А. П*. Бумажные денежные знаки на территории Беларуси 1769–2014: каталог. 2-е изд., доп. Минск : Минская ф-ка цвет. печ., 2014. 703 с.

53. *Пазднякоў В. С*. Папяровыя грошы Беларусі ад XVIII ст. да нашых дзён. Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2008. 212 с.

54. *Рыжкова С. А*. Налоговая политика государства в отношении купечества Беларуси во второй половине XVIII – первой половине XIX в. // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследаванняў: зб. навук. прац: у 2 ч. Мінск : БДПУ імя М. Танка, 2000. Ч. 2. С. 124–126.

55. *Рябцевич В. Н*. Нумизматика Беларуси. Минск : Полымя, 1995. 687 с.

56. *Самович А. Л*. Военнопленные XIX – начала XX в. в западном регионе России (историческое исследование). М. : Военный университет, 2011. 258 с.

57. *Самусік А. Ф.* Развіццё сістэмы асветы на беларускіх землях у 70-х гг. XVIII – 30-х гг. XIX ст.: дыс. … канд. гіст. навук: 07. 00. 02. Мінск, 1998. 136 л.

58. *Семенова С. А.* Купечество Беларуси во второй половине XVIII – первой половине XIX в.: дис. … канд. ист. наук: 07. 00. 02. Минск, 2004. 127 л.

59. *Синчук И.* Голландские червонцы Пилсудского, реформа Канкрина и народный курс // Pieniądzi systemy monetarne – wspólne dziedzictwo Europy. Studia i Materiały. Białoruś-Bułgaria-Litwa-Łotwa-Mołdawia-Polska-Rosja-Rumunia-Słowacja-Ukraina/ red. K. Filipowa, B. Kuklik. Augustów–Warszawa : ZGPTN, 2012. С. 255–276.

60. *Синчук* И. Литовско-белорусский рублёво-злотово-грошовый счёт конца XVIII – начала XIX века // Международная нумизматическая конференция, посвященная 150-летию Национального музея Литвы, Вильнюс, 26–28 апреля 2006. Доклады. Вильнюс, 2010. С. 347–366.

61. *Соболевская О. А.* Повседневная жизнь евреев Беларуси в конце XVIII – первой половине XIX века: монография. Гродно: ГрГУ им. Я. Купалы, 2012. 443 с.

62. *Соркіна І.* Мястэчкі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Вільня: ЕГУ, 2010. 488 с.

63. *Сосна У. А.* Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIШ – першай палове XIX ст. Мінск БДУ, 2000. 115 с.

64. *Токць С. М.* Дзяржаўны апарат царызму ў Беларусі ў 30–60-хх гг. XIX ст. (структура, функцыі, чыноўніцкі корпус): дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02. Мінск, 1997. 150 л.

65. *Трестьян И. Н.* Эволюция системы местных органов государственной власти на территории Беларуси (1772–1856 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02; БГПУ им. Максима Танка. Минск, 2018. 27 с.

66. *Филатова Е. Н.* Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси 1772–1860. Минск : Белорусская наука, 2006. 192 с.

67. *Шайкоў В. І.* Лёс Полацкага манетнага двара // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 2. С. 93–97.

68. *Шаўчэня М. М.* Развіццё гандлю ў Беларусі (канец XVIII – першая трэць XIX стст.): дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02. Гродна, 2003. 144 л.

69. *Шевкун П. В.* Империя и церковь: российская политика в отношении православия на территории Беларуси (1796–1855 гг.): монография. Витебск : ВГМУ, 2015. 202 с.

70. *Шишанов В. А.* К вопросу об обращении русских ассигнаций в губерниях «от Польши присоединенных» на рубеже XVIII–XIX вв. // Труды ГИМ. М., 2003. Вып. 138. С. 281–288. (Нумизматический сборник Государственного Исторического Музея. Т. XVI).

71. *Шишанов В.* «Иностранный биллон» в финансовой политике России первой половины XIX века // Банкаўскі веснік. 2010. № 7. С. 91–94.